## Міжнародны семінар па праекце ЮНЕСКА

**29 — 31 мая 2003 г.** у г. Пінску адбыўся міжнародны семінар “Стратэгія зберажэння і выкарыстання водных рэсурсаў і біяразнастайнасці ў Палессі” па праекце ЮНЕСКА “Распрацоўка трансгранічнай усходнееўрапейскай мадэлі рэгіянальнай экалагічнай сеткі “Палессе: Беларусь—Украіна—Польшча” і плана дзеянняў па яе інтэграцыі ў Агульнаеўрапейскую экалагічную сетку”, арганізаваны па ініцыятыве Нацыянальнага камітэта па праграме “Чалавек і

біясфера" і Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА. Падставай для супрацоўніцтва па дадзенай тэматыцы з'явілася прыняцце на 31-й сесіі Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА па ініцыятыве Беларусі і Украіны, пры падтрымцы дэлегацыі Польшчы, адпаведных паправак па праграмах "Узаемадзеянні, звязаныя з воднымі рэсурсамі: сістэмы, што падвяргаюцца небяспецы і сацыяльныя праблемы" і "Экалагічныя навукі", а таксама ўключэнне адпаведных палажэнняў у Мемарандум аб супрацоўніцтве паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і ЮНЕСКА, падпісаны ў ліпені 2002 г. падчас візіту Генеральнага дырэктара арганізацыі К.Мацууры ў нашу краіну.



Выступленне Пасла Францыі ў Беларусі С.Шмялеўскага

У рабоце семінара бралі ўдзел прадстаўнікі ААН, ЮНЕСКА, АБСЕ, Еўрапейскага саюза, Еўрапейскай камісіі, Пасол Францыі ў Беларусі, супрацоўнікі пасольстваў Швейцарыі і Украіны, вучоныя і спецыялісты з Вялікабрытаніі, Германіі, Латвіі, Польшчы, Сербіі і Чарнагорыі, Украіны, Францыі. Быў падпісаны Мемарандум паміж ЮНЕСКА і Прадстаўніцтвам ААН у Беларусі аб падтрымцы праекта. Удзельнікі семінара ў выніку абмеркавання праекта ЮНЕСКА прынялі выніковы дакумент, які падкрэслівае значнасць Палесся як буйнейшага ў Еўропе прыроднага рэгіёна, унікальнага аб'екта сусветнай прыроднай спадчыны. У дакуменце падкрэсліваецца, што стварэнне экалагічнай сеткі на тэрыторыі Палесся як часткі агульнаеўрапейскай, з'яўляецца адной з умоў устойлівага развіцця рэгіёна. У выпрацаваным стратэгічным плане дзеянняў прадугледжваецца ўвязка ключавых праблем рэгіёна з асноўнымі мэтамі праекта — стварэннем экалагічнай сеткі і развіццём турызму на Палессі. Для выканання работ па праекце па даручэнню Прэзідэнта Беларусі ў Нацыянальнай акадэміі навук прынята рашэнне аб стварэнні Каардынацыйнага цэнтра па супрацоўніцтву з ЮНЕСКА і іншымі міжнароднымі арганізацыямі.

Удзельнікі семінара звярнуліся да ЮНЕСКА, ПРААН, Сусветнага банка, Еўрапейскага саюза, урадаў краін Еўропы з заклікам дапамагчы праекту ў распрацоўцы трансгранічнай усходнееўрапейскай мадэлі рэгіянальнай экалагічнай сеткі і яе інтэграцыі ў Агульнаеўрапейскую экалагічную сетку з улікам прыроднай унікальнасці і міжнароднай значнасці Палесся. Па прапанове начальніка аддзела экалагічных навук Сакратарыята ЮНЕСКА П.Брыджуотэра было прынята рашэнне ўнесці на разгляд 32-й сесіі Генеральнай канферэнцыі прапановы прадугледзець у рэгулярным бюджэце арганізацыі фінансавання дзейнасці, якая абмяркоўвалася ў ходзе семінара. Ёсць падставы меркаваць, што адпавед-

ныя прапановы будуць разгледжаны і іншымі міжнароднымі структурамі — ўдзельнікамі семінара.